# III. САКРАЛЬНЕ МИСТЕЦТВО

**Уладзімір Карэлін, Мікалай Мельнікаў**

## Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі (частка 5)

У дадзеным паведамленні, як і ў папярэдніх [1, с. 335; 2, с. 486; 3, с. 152; 4, с. 95], разглядаюцца асаблівасці іканаграфіі асобных, рэдка сустракаемых на Беларусі абразоў, прыводзяцца іх тэхнічныя дадзеныя і падаюцца кароткія звесткі аб персанажах, згодна літаратурных крыніц [5–11]. Дні шанавання святых прыводзяцца па грыгарыянскаму і юліянскаму календарах. Пераважная частка разглядаемага матэрыялу набыта падчас экспедыцыйных даследаванняў і ўпершыню ўводзіцца ў навуковы зварот.

Прападобная Марыя Егіпецкая (? – 522) з'яўляецца хрысціянскай святой і лічыцца заступніцай жанчын, якія каяцца. Яна нарадзілася ў канцы V стагоддзя ў Егіпце. Згодна падання, у дванаццаць гадоў яна збегла з бацькоўскага дому і на працягу 17 гадоў займалася распустай у Александрыі. Аднойчы, перад святам Узвіжання Святога Крыжа, Марыя з групай паломнікаў аказалася ў Ерузалеме і хацела ўвасці ў храм, аднак нейкая сіла не пускала яе. Зразумеўшы, што гэта пакаранне за яе грахі, Марыя са слязамі маліла аб прабачэнні перад абразом Багародзіцы. Малітва была пачута, і Багародзіца падказала ёй шлях да выратавання – выдаліцца ў пустэльню на другі бераг Ярдана для пакаяння і пазнання Бога. У пустэльні Марыя вяла цяжкое аскетычнае жыццё і праз 47 гадоў сустрэла іераманаха Зосіму, якому распавяла сваю гісторыю. Праз год Зосіма выйшаў на бераг Ярдана са Святымі Дарамі і прычасціў Марыю, якая перайшла да яго па вадзе з другога берага. Яшчэ праз год Зосіма прыйшоў на месца іх першай сустрэчы, дзе знайшоў цела памерлай Марыі. З дапамогай дзікага льва ён выкапаў магілу і пахаваў праведніцу. Дзень яе памяці 14 (1) красавіка ў праваслаўнай царкве і 3 красавіка ў каталіцкай царкве.

Абразы з выявай Марыі Егіпецкай даволі часта сустракаюцца ў стараверскіх храмах. У праваслаўных і каталіцкіх храмах зафіксаваны толькі адзін такі абраз з в. Аркадзія Брэсцкай вобл., які зараз захоўваецца ў Музеі старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай



*Іл. 1. Прападобная Марыя Егіпецкая.*
*Брэсцкі раён, 1779 г., палатно, алей, 77×60, Ж-112, КП-205*

акадэміі навук Беларусі (МСБК). Кампазіцыя твора (*іл. 1*) адлюстроўвае эпізоды сустрэчы Марыі Егіпецкай з іераманахам Зосімай. На другім плане прадстаўлены момант іх першай сустрэчы, дзе Марыя апранае на голае цела гімацій, што даў ёй Зосіма, а апошні стаіць павярнуўшыся спіной, у разгубленасці ад нечаканай сустрэчы. Асноўную ўвагу мастак надаў другой сустрэчы Зосімы і Марыі, змясціўшы гэту падзею на пярэднім плане. Зосіма стаіць пад пальмай на беразе Ярдана са Святымі Дарамі ў руках, а з другога берага да яго па вадзе крочыць Марыя Егіпецкая. Унізе, з правага боку абраза, знаходзіцца выява памерлай Марыі, якая ляжыць каля ўвахода ў пячору. Побач з ёй змешчаны надпіс-пасланне да Зосімы: “Pogrzeb Oycze Zozyme nędzney Maryi Cialo. Day Ziemy ziemię amodl się za mną”. Крыху ніжэй бачны яшчэ адзін надпіс з датай стварэння абраза і прозвішчам мастака: “1779 DNIA 14 … Benedykt Pawlowsky malowal…”.

Севасційскія пакутнікі – гэта рымскія воіны-хрысціяне, якія пацярпелі за веру ў Хрыста ў Севасціі (зараз тэрыторыя Турцыі) ў 320 г., пры імператары Ліцыніі. За адказ прынесці ахвяру паганскім багам 39 воінаў былі раcпрануты і іх паставілі ў пакрытае лёдам возера, дзе яны прастаялі ўсю ноч і цудадзейным чынам не замерзлі. Уражаны гэтай падзеяй, яшчэ адзін рымлянін, Аглай, абвясціў сябе хрысціянінам, распрануўся і стаў у возера разам з астатнімі. Раніцай усе яны прынялі пакуты і былі спалены. Імёны пакутнікаў: Кірыён, Кандзід, Домн, Ісіхій, Іраклій, Смарагд, Еўноік, Уалент (Валент), Вівіан, Клаўдзій, Прыск, Феадул, Еўціхій, Іаан, Ксанфій, Іліан, Сісіній, Ангій, Аецій, Флавій, Акакій, Екдзікій, Лісімах, Аляксандр, Ілій, Гаргоній, Феафіл, Дамецыян, Гаій, Леонцій, Афанасій, Кіріл, Сакердон, Мікалай, Уалерый (Валерый), Філакцімон, Северыян, Худзіён, Мелітон і Аглай. Праваслаўная царква адзначае іх памяць 22 (9) сакавіка.

Абраз з Севасційскімі пакутнікамі зафіксаваны толькі ў адным выпадку ў праваслаўным храме Вілейскага раёна Мінскай вобл. (*іл. 2*). На ім прадстаўлены пакутнікі, якія па калена стаяць у ледзяной вадзе. Над іх галовамі лунаюць 39 каронаў. Крыху лявей, на беразе, знаходзіцца Аглай, таксама з каронай над галавой. У верхняй частцы абраза, на воблаках, прысутнічае выява бласлаўляючага аберуч Хрыста. Яшчэ вышэй змешчаны надпіс: “Св: м҃ Муч. Въ Сєвастійскомъ єзєрѣ мучившихсѧ”.

Яцак Адрованж, святы Гіяцынт (1183 ці 1185, Камень-Слёнскі – 15 жніўня 1257, Кракаў) – каталіцкі місіянер, дамініканскі манах. Паходзіць з багатага роду Адрованжаў. Навучаўся ў Празе і Кракаве, дзе ўступіў у шэрагі духавенства. У 1218 г., падчас знаходжання ў Рыме, уступіў у ордэн дамініканцаў. Пасля вяртання ў Кракаў, заснаваў там першы дамініканскі кляштар. У 1223 г. Яцак адправіўся з місіяй у Кіеў, дзе заснаваў дамініканскую абіцель. У 1240 г. ён вярнуўся ў Кракаў і заставаўся ў кляштары Найсвяцейшай Тройцы да самай смерці. Кананізаваны папай Кліментам VIII у 1594 г. Дзень памяці святога – 17 жніўня.

На адзіным абразе, што зафіксаваны ў Гродзенскай вобл., прадстаўлена поўнароставая выява святога Яцака ў аблачэнні дамініканскага манаха (*іл. 3*). У правай руцэ ён трымае манстранцыю са Святымі Дарамі, у левай – каменную



*Іл. 2. Севасційскія пакутнікі.*
*Вілейскі раён Мінскай вобл., канец XIXст., палатно, алей, 64×80*

скульптуру Маці Божай. Згодна падання, гэтыя рэліквіі Яцак уратаваў, калі ўцякаў з Кіева падчас татарскага нашэсця. Прычым, вялікая і масіўная скульптура Дзевы Марыі цудадзейным чынам стала зусім легкай і набыла сваю ранейшую вагу толькі пасля вяртання святога ў Кракаў.

Святы Каэтан Ціенскі (1480–1547) – заснавальнік каталіцкага ордэна рэгулярных клірыкаў, якія прызываліся цеацінцамі. Нарадзіўся і атрымаў адукацыю ў Італіі, займаўся пастырскай працай і дабрачыннасцю. Заснаваў некалькі кляштараў, дапамагаў бедным і ахвярам эпідэміі. Загінуў падчас грамадзянскай вайны ў Неапалі, спрабуючы спыніць кровапраліцце. У 1671 г. папа Клімент X далучыў Каэтана да ліку святых. Яго памяць шануецца 7 жніўня. Святы Каэтан лічыцца апекуном парадзіх, абаронцам ад эпідэмій чумы і галоднай смерці.

Абразы з выявай гэтага святога зафіксаваны ў двух касцёлах Беларусі. На адным з іх, што  ў Мядзельскім раёне Мінскай вобл. (канец XVIII ст., палатно, алей, 200×135), адлюстравана падзея яўлення святому Дзевы Марыі, якая даверыла Каэтану свайго сына. Святы ў манаскім аблачэнні ўкленчаны перад аналоем з кнігай і пальмавай сцяблінай. Абодвума рукамі ён трымае перад сабой аголенага дзіця-Хрыста на белай пялёнцы. Зверху на іх пазіраюць два анёлкі-пуці. На другім абразе з Воранаўскага раёна Гродзенскай вобл. (1763 г., палатно,

алей, 150×90) на пярэднім плане знаходзіцца св. Каэтан ў манаскім аблачэнні. Правую руку ён прыцiскае да грудзей, а левай паказвае на карзіну з садавінай, што знаходзіцца справа ўнізе. Зверху, з левага кута, на святога сыходзіць прамень святла і лунае Святы Дух у выглядзе голуба. На другім плане змешчана выява Галгофы з укрыжаваным Хрыстом. На жаль, абодва абразы былі непрафесійна паноўлены.



*Іл. 3. Святы Яцак Адрованж. Ашмянскі раён Гродзенскай вобл., пачатак XX ст., палатно, алей, 180×110*

Іканаграфічны сюжэт “Трыумф святой Алены (Знаходжанне Святога Крыжа)” паходзіць з Лідскага раёна Гродзенскай вобл. (зараз у калекцыі МСБК) і з’яўляецца пасвойму ўнікальным для беларускага сакральнага мастацтва, паколькі мастак замест тыповай кампазіцыі “Узвіжанне Святога Крыжа” стварыў разгорнуты аповед аб падарожжы св. Алены, маці імператара Канстанціна І Вялікага, у Ерузалем для пошукаў Святога Крыжа, на якім быў распяты Хрыстос. У цэнтры кампазіцыі (*іл. 4*) велічны карабель, узброены гарматамі, стромка плыве пад пунцовым ветразем па марскіх хвалях да Канстанцінопаля. Каля высокага носу карабля стаіць імператрыца Алена, багата апранутая ў зялёную з залатым узорам сукенку, панцыр, аздоблены залатымі ўстаўкамі, і залаты плашч. На яе галаве чырвоная з золатам карона, валасы ўпрыгожаны пярлінамі. Левай рукой Алена трымае Святы Крыж і тры цвікі. Яшчэ адзін цвік – у адведзенай правай руцэ. На бартах карабля ляжаць два крыжы разбойнікаў, на карме знаходзяцца сем чалавек каманды, адзін з якіх правіць шлях вялікім вяслом. З левага боку абраза, на фоне Ерузалема, прадстаўлена Галгофа, ля падножжа якой двое людзей пад кіраўніцтвам імператрыцы вядуць пошукі Святога Крыжа. З правага боку паказана ўрачыстая сустрэча св. Алены з яе каштоўнай знаходкай. З гарадской брамы Канстанцінопаля выходзіць шматлюдная працэсія з харугвамі, на беразе даюць салют з гарматы. У бухце, куды кіруе карабель, плаваюць дэльфіны, кіт, лебедзі і русалка. Лебедзі крычаць “vivat”, іх заклік падтрымоўвае русалка: “na niebie, w ziemi, i na morzu”. Зверху, над караблём, ляціць лебедзь з лаўровым вянком у лапах. Выгіб яго шыі працягваецца надпісам “S. HELENO Triumfuy”. Цікава, што на мачце і носе кара-




*Іл. 4. Трыумф св. Алены.*
*Лідскі раён Гродзенскай вобл., першая палова XVIII ст.,*
*палатно, алей, 85×73, Ж-362, КП-3715*

бля рэюць турэцкія сцягі. Верагодна, мастак намаляваў іх па той прычыне, што на той час Візантыя была захоплена Асманскай імперыяй.

Святая роўнаапостальная Ніна, асветніца Грузіі, нарадзілася ў Кападокіі (зараз Турцыя) ў 276 г. (па каталіцкім крыніцам; па праваслаўнай літаратуры – каля

280 г.). Згодна легенды, нейкі час жыла з бацькамі ў Ерузалеме, дзе прыняла хрост. Потым, ратуючыся ад ганенняў на хрыясціян, сыйшла ў Іверыю (Грузію), дзе праславілася цудамі. Пад уражаннем ад яе цудаў, цар Грузіі прыняў хрысціянства, а потым хрысціў і ўсю краіну. Памерла святая праведніца ў Кахеціі (Грузія) ў 340 г. (каталіцкія крыніцы) ці каля 335 г. (праваслаўная літаратура). Яе мошчы знаходзяцца ў Бадбійскім жаночым манастыры. Памяць св. Ніны шануецца 27 (14) студзеня.

У праваслаўных храмах Беларусі зафіксавана пяць абразоў з выявай святой роўнаапостальнай Ніны, створаных у канцы XIX – пачатку XX ст., дзе святая прадстаўлена ў маладым узросце, у царскім адзенні, з пакрытай галавой. На трох паясных абразах св. Ніна трымае ў руках Евангелле і крыж, на двух іншых, дзе яна прадстаўлена ў поўны рост *(іл. 5)*, у левай руцэ святой знаходзіцца скрутак з надпісам, а ў паднятай правай – адметны крыж. Гэты крыж, сплецены з вінаграднай лазы, ёй у сне ўручыла Маці Божая. Канцы крыжа апушчаны ўніз і ён аплецены валасамі праведніцы. Зараз гэта святыня захоўваецца ў галоўным саборы Тбілісі.

Хрысціянскі святы Спірыдон Трыміфунцкі (каля 270–348) шануецца ў ліку свяціцеляў як цудатворац. Ён нарадзіўся на востраве Кіпр, з дзіцячых гадоў пасвіў авечак і ў сваім жыцці стараўся браць прыклад са старазапаветных праведнікаў. У гады праўлення Канстанціна Вялікага (324–337) і яго сына Канстанцыя (337–361) св. Спірыдон быў абраны



*Іл. 5. Святая роўнаапостальная Ніна. Г. Камянец Брэсцкай вобл, пачатак XX ст., палатно, алей, 145×54*




*Іл. 6. Святы Спірыдон Трыміфунцкі. Ваўкавыскі раён Гродзенскай вобл., палатно, алей, 150×73*

першым епіскапам кіпрскага горада Трыміфунта, дзе, па царкоўным паданні, здзейсніў многа цудаў. На Першым Усяленскім Саборы ў 325 г., дзякуючы доказам Спірыдона было асуджана арыянства. Памёр свяцічель Спірыдон у 348 г., падчас малітвы. Дзень яго памяці – 25 (12) снежня ў праваслаўнай царкве і 14 снежня – ў каталіцкай.

На адзіным абразе з храма ў Гродзенскай вобл. (*іл. 6*) прадстаўлена выява св. Спірыдона ў поўны рост, у епіскапскім аблачэнні, з непакрытай галавой, доўгімі валасамі і барадой. Яго позірк скіраваны ўгару, у паднятай левай руцэ ён трымае закрытую кнігу, правая прыціснута да грудзей.

Святы Станіслаў – епіскап Кракаўскі, пакутнік, нябесны апякун Польшчы, нарадзіўся ў 1030 г. ў с. Шчэпанаве. Пасля атрымання адукацыі стаў святаром і канонікам у саборы Кракава, праславіўся як прапаведнік, і ў 1072 годзе быў абраны епіскапам Кракаўскім. Як пастыр, стаяў на стражы маральнага парадку і царкоўнага права. Уступіў у канфлікт з каралём Баляславам Смелым і быў забіты ім 11 красавіка 1079 г., падчас месы ў храме св. Міхала ў Кракаве. Папа Інакенці IV у 1253 г. кананізаваў св. Станіслава. Яго памяць адмячаецца ў Каталіцкай Царкве 11 красавіка.

У касцёлах Беларусі выяўлены тры абразы з выявай забойства св. Станіслава. Кампазіцыя на



*Іл. 7. Забойства св. Станіслава.*
*Г. Іўе Гродзенскай вобл., XVIII ст., палатно, алей, 120×84*

ўсіх абразах фактычна аднолькавая, што ўказвае на наяўнасць пакуль што неўстаноўленага першавобраза. Так, з правага боку абраза з Гродзеншчыны (*іл. 7*)

знаходзіцца выява св. Станіслава перад алтаром. У паднятай правай руцэ ён трымае госцію. Са спіны да яго імкліва рухаецца кароль Баляслаў з паднятай над галавой шабляй, гатовы нанесці смяротны ўдар. На пярэднім плане бачны ўкленчаны касцельны служка са званочкам у руцэ, на другім – група спалоханых вернікаў, адзін з якіх спрабуе спыніць раз’юшанага караля. Зверху да св. Станіслава спускаецца анёлак з вянком пакутніка ў руках.

Святы Аўгустын – епіскап, багаслоў і філосаф, адзін з чатырох каталіцкіх Айцоў Царквы – нарадзіўся 13 лістапада 354 г. у Тагасце ў Нумідыі (сучасны Алжыр). Яго маці, св. Моніка, выхоўвала сваіх дзяцей у хрысціянскай веры, аднак толькі ў 387 г., апынуўшыся ў Мілане, Аўгустын прыняў хрост з рук св. Амброзія. Пасля вяртання ў Афрыку Аўгустын атрымаў святарскае пасвячэнне і праз нейкі час стаў біскупам горада Гіпона ў Паўночнай Афрыцы. На гэтым пасту ён заставаўся да самай смерці, якая адбылася 28 студзеня 430 г. Мошчы св. Аўгустына знаходзяцца ў саборы св. Пятра ў г. Павія ў Італіі. Ён напісаў велізарную колькасць багаслоўскіх прац. Святы з’яўляецца апекуном тэолагаў, друкароў і піўвараў. Росквіт яго шанавання прыходзіцца на XII–XIII ст., часы стварэння Аўгустынскага ордэна, супольнікі якога карысталіся некаторымі ўказаннямі, узятымі з выказванняў і зваротаў св. Аўгустына. Памяць св. Аўгустына ў Каталіцкай Царкве – 28 жніўня, у Рускай Праваслаўнай Царкве – 15 чэрвеня па старым стылі.

У касцёлах Беларусі выяўлены два абразы з выявай св. Аўгустына, якія зараз захоўваюцца ў МСБК. На адным *(іл. 8)* святы ў епіскапскім аблачэнні сядзіць за столікам, дзе знаходзяцца яго трактаты. Кнігі ляжаць і на падлозе, на адну з іх Аўгустын абапіраецца нагой. Яго тулава на тры чвэрці павернута ўправа, позірк скіраваны ўверх. Рукі разведзены ўбакі, у левай святы трымае свой атрыбут – палаючае сэрца – як сімвал рэлігійнага гарэння і жарсці, у правай – гусінае пяро. Яшчэ адзін атрыбут святога – ракавінку – яму падае маленькае дзіця, якое сядзіць унізе каля століка. Злева, у верхняй частцы абраза, змешчана разгорнутая кніга з адным з выказванняў св. Аўгустына. На другім абразе з калекцыі МСБК (першая палова XIX ст., палатно, алей, 234×139, Ж-39, КП-449) прадстаўлена роставая выява святога ў епіскапскім аблачэнні, з густой сівой барадой. У правай руцэ ён трымае свой атрыбут – палаючае сэрца, яго позірк скіраваны ў левы верхні вугал абраза, дзе змешчана выява Новазапаветнай Тройцы. Унізе, каля ног святога, знаходзяцца тры анёлкі. Адзін з іх трымае на руках раскрытую кнігу, два другіх падтрымоўваюць мантыю св. Аўгустына, як знак таго, што ён з’яўляецца родапачынальнікам Аўгустынскага ордэна.

Як бачна з вышэй разгледжанага, у храмах Беларусі, побач з традыцыйнай іканаграфіяй (роставымі ці паяснымі адлюстраваннямі святых і пакутнікаў са сваімі атрыбутамі і сімваламі пакутніцтва), сустракаюцца творы з кампазіцыйнымі асаблівасцямі і разгорнутым апавядальным сюжэтам, такія як “Марыя Егіпецкая” і “Трыумф св. Алены”. На некаторых абразах адлюстраваны найбольш значныя і кульмінацыйныя моманты жыцця святых. Гэта абумоўлена як уздзе-



*Іл. 8. Святы Аўгустын.*
*Гродзенская вобл., XVIII ст., палатно,*
*алей, 126×95, Ж-80, КП-845*

яннем заходнееўрапейскага мастацтва, так і праяўленнем творчых асаблівасцей мясцовых іканапісных майстэрань.

1. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі // Історія релігій в Україні: наук. щоріч. Львів, 2015. Кн. 2. С. 335–350.

2. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі (частка 2) // Історія релігій в Україні: наук. щоріч. Львів, 2016. Ч. 2, 3. С. 486–497.

3. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканапісу Беларусі // Історія релігій в Україні: наук. щоріч. Львів, 2017. Ч. 2. С. 152–163.

4. Карэлін У. Р., Мельнікаў М. П. Рэдкія сюжэты ў іканаграфіі святых у храмах Беларусі // Історія релігій в Україні: наук. щоріч. Львів, 2018. Ч. 2. С. 95–115.

5. Католическая энциклопедия. Москва: Изд-во Францисканцев, 2002. Т. 1. 1906 с.

6. Католическая энциклопедия. Москва: Изд-во Францисканцев, 2005. Т. 2. 1818 с.

7. Католическая энциклопедия. Москва: Изд-во Францисканцев, 2007. Т. 3. 1910 с.

8. Католическая энциклопедия. Москва: Изд-во Францисканцев, 2011. Т. 4. 1962 с.

9. Католическая энциклопедия. Москва: Изд-во Францисканцев, 2013. Т. 5. 934 с.

10. Сорок_Севастийских_мучеников. URL: https://ru.wikipedia.org/wiki/.

11. Спиридон_Тримифунтский. URL: https://ru.wikipedia.org/wiki/.

**Галіна Флікоп-Світа**

# Скульптуры ў прысценных алтарах грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі ў XVIII – пачатку XIX ст.: на матэрыяле захаваных помнікаў і архіўных крыніц

Дадзены артыкул прысвечаны цікавай, аднак даволі слаба распрацаванай праблеме – наяўнасці фігуратыўных скульптур у алтарах уніяцкіх храмаў. Скульптуры маглі служыць і дэкорам у навершшы, у крылах або па самім каркасе (напрыклад, выявы анёлаў, херувімаў), а маглі выступаць у ролі галоўнай выявы. У дадзеным артыкуле мы засяродзімся менавіта на тых скульптурах, якія ў алтарах былі семантычнай дамінантай і кампазіцыйным цэнтрам. Не гледзячы на дастатковае распаўсюджанне ў грэка-каталіцкіх цэрквах, скульптуры ўніяцкіх храмаў Беларусі ніколі не абіраліся аб'ектам спецыяльнага даследавання. Некаторыя помнікі былі апублікаваны ў музейных каталогах альбо спецыялізаваных выданнях, прысвечаных сакральнай скульптуры, аднак там яны былі прадстаўлены ў шэрагу помнікаў іншых канфесій. Такім чынам, мэтанакіравана алтарныя скульптуры вывучаліся.